Так, Вярхоўны Савет, мякка кажучы, пакідае жадаць лепшага. Дык што, Шушкевіч павінен яго знянацку разагнаць, як матрос Жалязняк Установчы сход? Так, прыняты шэраг недасканалых заканадаўчых актаў. Хіба ж Шушкевіч зрабіў іх такімі? Сапраўды, новы Старшыня парламента не пляскае ў далоні кожнай прапанове апазіцыі. Дзе, у якой краіне вы бачылі гэткае?

Ды і наогул, ці варта сапець над вухам у чалавека, які распачаў новую работу?

Трэба парадавацца за Станіслава Станіслававіча. Ён на гэтым сходзе трымаўся дастойна, сапраўды інтэлігентна, уражваў акрэсленай пазіцыяй. Не з усімі ягонымі меркаваннямі можна пагадзіцца, а асобныя, накшталт заяў аб «разгуле дэмакратыі», некалькі насцярожваюць. Але нельга не ўхваліць яго логіку, перакананасць, адкрытасць. І — смеласць. Бо, абвяргаючы рэвалюцыйны націск на вышэйшыя кіраўнічыя канструкцыі рэспублікі, ён прапануе такую эвалюцыю, ад якой яму самому, як мінімум, лягчэй жыць не стане.

З выступлення С. ШУШКЕВІЧА ў Палацы культуры нафтавікоў:

— Ужо семнаццатага снежня на сесіі я мушу паставіць пытанне аб рэарганізацыі сістэмы заканадаўчай улады па схеме: з'езд народных дэпутатаў — пастаянна працуючы Вярхоўны Савет. Трэба адмовіцца ад велізарнага парламента, у якім трыста сорак шэсць дэпутатаў. Пры такой колькасці частка з іх не ўдзельнічае ў рабоце. Таму, здараецца, і кворуму няма. Дастаткова 90 членаў Савета, але ў якасці пастаяннага рабочага органа, які набудзе патрэбную дынамічнасць. Неабходна скараціць і Прэзідыум з 27 да 11 чалавек. Далей. У нас вельмі непаваротлівы ўрад. 53 камітэты і міністэрствы, 9 намеснікаў Старшыні Саўміна — куды гэта варта? І, вядома ж, гаворка ідзе не толькі аб новай структуры, але і аб кадравых зменах. Але не трэба занадта пільна і нядобразычліва прыглядацца да біяграфій урадавых чыноўнікаў. Немагчыма стварыць на гэтым узроўні каманду высакакласных прафесіяналаў, каб ніхто з іх не быў звязаны ў мінулым з сістэмай адміністрацыйнага гаспадарання. Галоўнае — каб яны цяпер працавалі ўмела і сумленна. У крытычны перыяд пераходу да рынку нам усім востра патрэбны грамадзянскі мір, а ўраду—давер.

Калі ўспомніць, з якой праграмай выступаў С. Шушкевіч перад абраннем яго на пасаду Старшыні Вярхоўнага Савета, то трэба пагадзіцца, што ён выконвае яе даволі паслядоўна і аргументавана абараняе. Хочацца верыць, што ідэя рэканструкцыі вышэйшых органаў ажыццявіцца і не нанясе ўдар па апазіцыі або іншых плынях у парламенце. Інакш кажучы, каб не паўтарыўся лук'янаўскі варыянт «паляпшэння» Вярхоўнага Савета.

А наогул нашым парламентарыям і іх кіраўніку трэба, відаць, дзейнічаць больш радыкальна, бо час ідзе, а цярпенне і ў беларусаў не гумавае. І калі С. Шушкевіч мае рацыю, гаворачы, што мы з Расіяй на адной вяровачцы, то, мусіць, варта хутчэй браць з яе прыклад. Ісці поруч з ёй па шляху эканамічных рэформ, а не плесціся ў хвасце, спадзеючыся на ўяўны палітычны саюз. Не мы яго разбурылі. Не нам яго і ўзнаўляць...

Сяргей БУТКЕВІЧ.
г. Навапалацк.

Нам стало известно

К 1000-летию Полоцкой епархии

Будущий 1992 год станет на Беларуси годом большого общецерковного и общенационального празднества, сообщили редакции в Минском епархиальном управлении.

Научный коллоквиум, организованный Белорусской православной церковью, рассмотрел важный исторический вопрос — о начале Полоцкой епархии. По мнению ученых, именно 992 год следует считать отправной датой православия на Беларуси.

Тогда, как указывают летописи, киевский князь Владимир, уже четыре года как принявший христианство, направил сына Изяслава с его матерью Рогнедой в их родовую «отчину» — Полоцкую землю. И тогда же киевский митрополит Леонтий вместе с сыновьями князя посылал епископов «веру православную непорочно держати».

Учреждение Полоцкой епархии явилось важнейшим событием в начальной истории Беларуси. В связи с этим Министерство культуры республики поддержало инициативу сооружения памятника Рогнеде и Изяславу.

Соб. инф.

Московские новости

Прости их, Господи!

Свою мрачную известность улица Матросская Тишина приобрела среди москвичей по причине находящейся здесь тюрьмы предварительного заключения, ставшей местом содержания под стражей бывших членов ГКЧП.

Недавно вокруг зловещего здания с зарешеченными окнами, окруженного мощной пятиметровой стеной с витками колючей проволоки наверху, прошел многолюдный крестный ход, проведенный катакомбной православной церковью, возглавляемой архиепископом Московским и Кашинским Лазарем.

Духовная акция предполагала встречу с маршалом Д. Язовым, его покаяние за содеянное и отпущение грехов, которые совершили военные в августовские дни. Однако начальник тюрьмы не только не разрешил священнику встретиться с Язовым, но даже не пожелал выйти из своих апартаментов.

Это обстоятельство не помешало отслужить молебен у главного входа, освятить греховное место и попросить у Господа милости к несчастным узникам Матросской Тишины.

За слово—400 тысяч рублей

В Моссовете ожидается новый скандал. Он связан с взысканием крупной страховой суммы за оскорбление, нанесенное в общественном месте депутатскому корпусу столицы одним из коллег В. Мироновым.

Однажды на митинге народный избранник назвал Моссовет «дерьмом». Оскорбление было продублировано по телевидению.

Группа депутатов обратилась в связи с этим инцидентом в страховую компанию с требованием выплатить им компенсацию за моральный ущерб: она в свое время застраховала всех депутатов Моссовета по 1.000 рублей каждого от последствий моральных травм. Обратившиеся с заявлением депутаты посчитали ситуацию подходящей для взыскания денег. Компания намерена выполнить требования своих клиентов.

Если компенсация за моральный ущерб будет выплачена всем депутатам Моссовета, то с любителя митинговых баталий будет взыскано через суд более 400 тысяч рублей. Вот в такую копеечку может влететь одно слово, сказанное необдуманно.

Леонид ФАДЕЕВ.

Закон Рэспублікі Беларусь

Аб унясенні змяненняў у некаторыя заканадаўчыя акты Рэспублікі Беларусь па пытаннях аховы мацярынства і дзяцінства і дзяржаўнай дапамогі сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей

Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь **пастанаўляе:**

Унесці змяненні ў наступныя заканадаўчыя акты Рэспублікі Беларусь:

1. У Кодэкс законаў аб працы Рэспублікі Беларусь, зацверджаны Законам Рэспублікі Беларусь ад 23 чэрвеня 1972 года (ЗЗ БССР, 1972 г., № 18, арт. 266; 1982 г., № 36, арт. 672; 1990 г., № 22, арт. 451);

Артыкулы 165 і 167 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«Артыкул 165. Водпуск па цяжарнасці і родах

Жанчынам прадастаўляецца водпуск па цяжарнасці і родах працягласцю семдзесят каляндарных дзён да родаў і пяцьдзесят шэсць (у выпадках ускладненых родаў або нараджэння двух і больш дзяцей — семдзесят) каляндарных дзён пасля родаў, з выплатай за гэты перыяд дапамогі па дзяржаўнаму сацыяльнаму страхаванню. Водпуск па цяжарнасці і родах вылічваецца сумарна і прадастаўляецца жанчыне цалкам, незалежна ад колькасці дзён, фактычна выкарыстаных да родаў»;

«Артыкул 167. Водпуск па догляду за дзіцем

Незалежна ад працоўнага стажу па жаданню жанчыны ёй прадастаўляецца водпуск па догляду за дзіцем да дасягнення ім узросту трох гадоў, з выплатай за гэты перыяд штомесячнай дзяржаўнай дапамогі, размеры і ўмовы выплаты якой устанаўліваюцца заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Водпуск па догляду за дзіцем да дасягнення ім узросту трох гадоў прадастаўляецца цалкам або па частках маці дзіцяці або па меркаванню сям'і працуючым бацьку або іншым сваякам, якія фактычна ажыццяўляюць догляд за дзіцем.

Па жаданню асоб, указаных у частцы другой гэтага артыкула, у перыяд знаходжання іх у водпуску па догляду за дзіцем яны могуць працаваць на ўмовах няпоўнага рабочага часу або дома. Пры гэтым за імі захоўваецца права на атрыманне штомесячнай дзяржаўнай дапамогі.

За час водпуску па догляду за дзіцем захоўваецца месца работы (пасада).

Перыяд знаходжання ў водпуску па догляду за дзіцем залічваецца ў агульны і бесперапынны стаж работы, а таксама ў стаж работы па спецыяльнасці.

У стаж работы, які дае права на наступныя штогадовыя водпускі, час водпуску, указанага ў гэтым артыкуле, не залічваецца».

2. У артыкуле 162 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях, прынятага Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь 6 снежня 1984 года (ЗЗ БССР, 1984 г., № 35, арт. 505; 1985 г., № 32, арт. 449; 1987 г., № 22, арт. 282):

У частцы першай словы «да трыццаці рублёў» замяніць словамі «да пяцідзесяці рублёў»;

у частцы другой словы «ад дзесяці да трыццаці рублёў» замяніць словамі «ад трыццаці да пяцідзесяці рублёў».

3. У Кодэкс аб шлюбе і сям'і Рэспублікі Беларусь, зацверджаны Законам Рэспублікі Беларусь ад 13 чэрвеня 1969 года (ЗЗ БССР, 1969 г., № 17, арт. 278; 1987 г., № 6, арт. 66):

У артыкуле 33 словы «на працягу аднаго года» замяніць словамі «на працягу трох гадоў»;

у частцы першай артыкула 81 словы «не менш 20 рублёў» замяніць словамі «не менш паловы ўстаноўленай у рэспубліцы мінімальнай заработнай платы»;

частку першую артыкула 82 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«Сродкі, што спаганяюцца з бацькоў на ўтрыманне дзяцей, якія знаходзяцца ў дзяржаўных дзіцячых установах, пераводзяцца на асабістыя рахункі выхаванцаў у ашчадным банку ў размерах, устаноўленых артыкулам 81 гэтага Кодэкса. У гэтых выпадках сродкі на ўтрыманне дзяцей спаганяюцца з кожнага з бацькоў, калі яны не вызвалены па закону ад унясення платы за ўтрыманне дзяцей».

4. Гэты Закон увесці ў дзеянне з моманту прыняцця.

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь
С. ШУШКЕВІЧ.

14 лістапада 1991 г.
гор. Мінск.

Народная газета

ЗАКОН РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Аб замежных інвестыцыях на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь

Гэты Закон вызначае парадак ажыццяўлення замежных інвестыцый на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь і накіраваны на стварэнне ўмоў па прыцягненню і выкарыстанню сродкаў замежных інвестараў у мэтах развіцця эканомікі рэспублікі.

Палажэнні гэтага Закона дзейнічаюць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у прымяненні да ўсіх замежных інвестараў і прадпрыемстваў з замежнымі інвестыцыямі.

Глава I. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

Артыкул 1. Замежныя інвестыцыі

Замежныя інвестыцыі — гэта ўкладзеныя замежнымі юрыдычнымі і фізічнымі асобамі фінансавыя і матэрыяльныя сродкі ў розныя аб'екты дзейнасці, а таксама перададзеныя правы на маёмасную і інтэлектуальную ўласнасць гаспадарніцкім суб'ектам Рэспублікі Беларусь з мэтай атрымання прыбытку (даходу) або дасягнення сацыяльнага эфекту.

Артыкул 2. Аб'екты замежных інвестыцый

Аб'ектам замежных інвестыцый на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь могуць быць:

любыя прадпрыемствы і арганізацыі, якія займаюцца дзейнасцю, не забароненай на тэрыторыі рэспублікі;

будынкі і збудаванні, маёмасць беларускіх юрыдычных і фізічных асобаў;

акцыі, банкаўскія ўклады, страхавыя полісы і іншыя каштоўныя паперы і сродкі;

навукова-тэхнічная прадукцыя;

правы на інтэлектуальныя каштоўнасці;

іншая маёмасць і набытыя маёмасныя правы, уключаючы правы на карыстанне зямлёй і іншымі прыроднымі рэсурсамі рэспублікі для ажыццяўлення сваёй дзейнасці.

Артыкул 3. Суб'екты замежных інвестыцый

Замежнымі інвестарамі на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь могуць быць замежныя дзяржавы, аб'яднанні, міжнародныя арганізацыі, замежныя юрыдычныя і фізічныя асобы, а таксама грамадзяне Рэспублікі Беларусь, якія маюць пастаяннае месца жыхарства за мяжой.

Артыкул 4. Арганізацыйна-прававыя формы і віды замежных інвестыцый

Замежныя інвестыцыі на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь могуць ажыццяўляцца ў формах:

долевага ўдзелу ў прадпрыемствах, якія ствараюцца сумесна з беларускімі юрыдычнымі і фізічнымі асобамі;

стварэння прадпрыемстваў, якія цалкам належаць замежным інвестарам;

набыцця прадпрыемстваў, будынкаў, збудаванняў, акцый і іншых каштоўных папер;

набыцця правоў карыстання зямлёй, іншымі прыроднымі рэсурсамі, а таксама іншых маёмасных правоў;

у любых іншых формах гаспадарчай і іншай дзейнасці, якія не супярэчаць заканадаўству, што дзейнічае на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 5. Прававы статус прадпрыемстваў з замежнымі інвестыцыямі і замежных інвестараў

Прадпрыемствы з замежнымі інвестыцыямі і замежныя інвестары ажыццяўляюць сваю дзейнасць у парадку, прадугледжаным законамі аб прадпрыемствах, прадпрымальніцкай і інвестыцыйнай дзейнасці, іншым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, з улікам палажэнняў, устаноўленых гэтым Законам і міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь.

Глава II. СТВАРЭННЕ І ДЗЕЙНАСЦЬ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ З ЗАМЕЖНЫМІ ІНВЕСТЫЦЫЯМІ

Артыкул 6. Прадпрыемства з замежнымі інвестыцыямі

Пад прадпрыемствам з замежнымі інвестыцыямі разумеецца прадпрыемства, ва ўстаноўчым фондзе якога часткова (сумеснае прадпрыемства) або цалкам (замежнае прадпрыемства) выкарыстоўваецца замежны капітал.

Сумесным прадпрыемствам на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь з'яўляецца гаспадарніцкі суб'ект Рэспублікі Беларусь, устаноўчы фонд якога складаецца з долі замежнага інвестара і долі фізічных і юрыдычных асобаў Рэспублікі Беларусь.

Замежным прадпрыемствам з'яўляецца створанае ў якасці юрыдычнай асобы паводле заканадаўства Рэспублікі Беларусь прадпрыемства або арганізацыя, у якой замежныя інвестыцыі складаюць 100 працэнтаў.

Прадпрыемствы з замежнымі інвестыцыямі з'яўляюцца юрыдычнымі асобамі Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 7. Стварэнне прадпрыемстваў з замежнымі інвестыцыямі

Прадпрыемства з замежнымі інвестыцыямі можа быць утворана або шляхам яго заснавання, ці ў выніку набыцця замежным інвестарам долі ўдзелу (пая, акцыі) у раней заснаваным прадпрыемстве без замежных інвестыцый, або набыцця такога прадпрыемства цалкам.

Сумесныя прадпрыемствы ствараюцца ў форме акцыянерных таварыстваў, таварыстваў з абмежаванай адказнасцю і іншых гаспадарчых суполак і таварыстваў, а таксама ў іншых формах, якія не супярэчаць заканадаўчым актам Рэспублікі Беларусь.

Сумеснае прадпрыемства ствараецца на аснове дагавора, заключанага ўдзельнікамі гэтага прадпрыемства.

Рашэнне аб стварэнні сумеснага і замежнага прадпрыемства прымаецца яго ўдзельнікамі самастойна. У выпадку, калі беларускім удзельнікам з'яўляецца дзяржаўнае прадпрыемства або прадпрыемства грамадскага аб'яднання, рашэнне аб стварэнні сумеснага прадпрыемства прымаецца яго ўдзельнікамі са згоды ўласніка маёмасці або ўпаўнаважанага ім органа.

Рашэнне аб стварэнні сумеснага прадпрыемства з асноўнымі фондамі звыш 30 млн. рублёў у цэнах, дзеючых на момант прыняцця гэтага Закона, прымаецца ўдзельнікамі з дазволу Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Асаблівасці стварэння прадпрыемства, якое цалкам належыць замежнаму інвестару, вызначаецца ў парадку, які ўстанаўліваецца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 8. Стварэнне даччыных прадпрыемстваў, філіялаў, іншых адасобленых падраздзяленняў і прадстаўніцтваў прадпрыемстваў з замежнымі інвестыцыямі, іх статус

Прадпрыемства з замежнымі інвестыцыямі можа ствараць за кошт уласных сродкаў ва ўстаноўленым парадку даччыныя прадпрыемствы з правамі юрыдычнай асобы, а таксама філіялы і прадстаўніцтвы на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь і за яе межамі з захаваннем умоў, прадугледжаных дзеючым на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь заканадаўствам і адпаведным заканадаўствам замежных дзяржаў.

Філіялы і прадстаўніцтвы прадпрыемстваў з замежнымі інвестыцыямі дзейнічаюць на падставе палажэнняў аб іх, якія зацвярджаюцца прадпрыемствам з замежнымі інвестыцыямі. Яны адкрываюць рахункі ва ўпаўнаважаных на тое банках. На тэрыторыі Рэспублікі Беларусь філіялы, прадстаўніцтвы і іншыя адасобленыя падраздзяленні не з'яўляюцца юрыдычнымі асобамі.

Прадпрыемствы з замежнымі інвестыцыямі, зарэгістраваныя па-за межамі рэспублікі, могуць ствараць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь толькі даччыныя прадпрыемствы з правамі юрыдычнай асобы.

Артыкул 9. Дзяржаўная рэгістрацыя прадпрыемстваў з замежнымі інвестыцыямі і ўдзельнікаў знешнеэканамічнай дзейнасці

Дзяржаўная рэгістрацыя прадпрыемстваў з замежнымі інвестыцыямі ў якасці юрыдычнай асобы і ўдзельніка знешнеэканамічнай дзейнасці ажыццяўляецца ў Дзяржаўным камітэце Рэспублікі Беларусь па знешніх эканамічных сувязях або ў іншым упаўнаважаным на тое дзяржаўным органе, які ў дзесяцідзённы тэрмін паведамляе даныя аб рэгістрацыі Міністэрству фінансаў Рэспублікі Беларусь і Дзяржаўнаму камітэту Рэспублікі Беларусь па статыстыцы і аналізу для ўключэння іх у дзяржаўныя рэестр і рэгістр Рэспублікі Беларусь.

Банкі і іншыя фінансава-крэдытныя ўстановы з замежнымі інвестыцыямі падлягаюць рэгістрацыі ў Нацыянальным банку Рэспублікі Беларусь.

Дзяржаўная рэгістрацыя прадпрыемстваў з замежнымі інвестыцыямі ажыццяўляецца пры наяўнасці згоды мясцовага Савета народных дэпутатаў у адпаведнасці з яго кампетэнцыяй і наступных дакументаў:

1) для сумесных прадпрыемстваў:

а) пісьмовай заявы заснавальнікаў з просьбай правесці рэгістрацыю ствараемага прадпрыемства;

б) натарыяльна завераных копій устаноўчых дакументаў у двух экземплярах;

в) для беларускіх юрыдычных асобаў— натарыяльна заверанай копіі рашэння ўласніка маёмасці аб стварэнні прадпрыемства ці копіі рашэння ўпаўнаважанага ім органа, а таксама натарыяльна завераных копій устаноўчых дакументаў для кожнай беларускай юрыдычнай асобы, якая ўдзельнічае ў стварэнні сумеснага прадпрыемства;

г) дакумента аб плацежаздольнасці замежнага інвестара, выдадзенага банкам ці іншай крэдытна-фінансавай установай, якія абслугоўваюць яго (з завераным перакладам на беларускую мову);

д) выпіскі з гандлёвага рэестра краіны паходжання ці іншага эквівалентнага доказу юрыдычнага статусу замежнага інвестара ў адпаведнасці з заканадаўствам краіны яго месцазнаходжання ці пастаяннага месца жыхарства (з завераным перакладам на беларускую мову);

2) для замежных прадпрыемстваў:

а) пісьмовай заявы на рэгістрацыю ад замежнага інвестара;

б) натарыяльна заверанай копіі ўстаноўчых дакументаў (у двух экземплярах);

в) дакумента аб плацежаздольнасці замежнага інвестара, выдадзенага банкам або іншай крэдытна-фінансавай установай, якія абслугоўваюць яго (з завераным перакладам на беларускую мову);

г) выпіскі з гандлёвага рэестра краіны паходжання для замежнага інвестара (з завераным перакладам на беларускую мову).

Тэрміны рэгістрацыі прадпрыемства з замежнымі інвестыцыямі не павінны перавышаць 30 дзён з моманту падачы заявы і неабходных дакументаў на рэгістрацыю.

Прадпрыемства з замежнымі інвестыцыямі набывае правы юрыдычнай асобы з дня яго рэгістрацыі. Паведамленні аб рэгістрацыі публікуюцца ў афіцыйным друку органам, які ажыццявіў рэгістрацыю. Адмова ў рэгістрацыі можа быць абскарджана ў гаспадарчым або іншым судзе ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Пры адсутнасці па сканчэнні аднаго года пасля рэгістрацыі дакументальнага пацвярджэння факта ўнясення кожным з удзельнікаў 50 працэнтаў, указаных ва ўстаноўчых дакументах укладаў, ва ўстаноўчы фонд, орган, які зарэгістраваў гэта сумеснае прадпрыемства, прызнае яго несапраўдным, аб чым паведамляе Міністэрству фінансаў Рэспублікі Беларусь і Дзяржаўнаму камітэту Рэспублікі Беларусь па статыстыцы і аналізу для выключэння яго з дзяржаўных рэестра і рэгістра Рэспублікі Беларусь. Інфармацыя аб выключэнні з рэестра публікуецца ў афіцыйным друку органам, які ажыццявіў яго рэгістрацыю.

У выключных выпадках тэрміны ўнясення 50 працэнтаў укладу ва ўстаноўчы фонд могуць быць падоўжаны ўдзельнікам сумеснага прадпрыемства па рашэнню Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 10. Экспертыза ствараемых прадпрыемстваў з замежнымі інвестыцыямі

На стадыі пачатку гаспадарчай дзейнасці прадпрыемстваў з замежнымі інвестыцыямі яго стваральнікі абавязаны ў выпадках і ў парадку, прадугледжаных заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, атрымаць заключэнне санітарна-эпідэміялагічнай і экалагічнай службаў. Экспертыза і зацвярджэнне інвестыцыйных праектаў і праграм праводзяцца ў адпаведнасці з Законам «Аб інвестыцыйнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь».

Артыкул 11. Ліквідацыя прадпрыемстваў з замежнымі інвестыцыямі

Ліквідацыя і рэарганізацыя прадпрыемства з замежнымі інвестыцыямі ажыццяўляецца ў выпадках і парадку, прадугледжаных артыкуламі 106—109 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб прадпрыемствах у Рэспубліцы Беларусь» і іншымі законамі Рэспублікі Беларусь. Ліквідацыя прадпрыемства можа ажыццяўляцца таксама ў выпадку незахавання парадку фарміравання ўстаноўчага фонду, прадугледжанага ўстаноўчымі дакументамі.

Рэгістрацыя ліквідацыі і рэарганізацыі прадпрыемства з замежнымі інвестыцыямі ажыццяўляецца зарэгістраваўшым яго органам на падставе акта ліквідацыйнай камісіі або іншага органа, які праводзіць ліквідацыю, ці рашэння ўпаўнаважанага на ажыццяўленне рэарганізацыі органа. Паведамленне аб ліквідацыі публікуецца ў афіцыйным друку органам, які яго зарэгістраваў.

Артыкул 12. Рэгламентацыя дзейнасці прадпрыемстваў з замежнымі інвестыцыямі

Прадпрыемства з замежнымі інвестыцыямі можа ажыццяўляць тыя віды дзейнасці, якія вызначаны статутам прадпрыемства. Асобнымі відамі дзейнасці, пералік якіх рэгламентуецца дзеючым на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь заканадаўствам, прадпрыемства з замежнымі інвестыцыямі можа займацца толькі на падставе спецыяльных дазволаў (ліцэнзій).

Артыкул 13. Кантроль за дзейнасцю прадпрыемстваў з замежнымі інвестыцыямі

Кантроль за фінансава-гаспадарчай дзейнасцю прадпрыемстваў з замежнымі інвестыцыямі ажыццяўляецца Міністэрствам фінансаў Рэспублікі Беларусь і Дзяржаўным камітэтам Рэспублікі Беларусь па знешніх эканамічных сувязях у частцы кантролю па захаванню статутнай дзейнасці і ў дачыненні да прадпрыемстваў з удзелам дзяржаўнай маёмасці.

Прадпрыемствы з замежнымі інвестыцыямі абавязаны прадстаўляць гэтым органам прадугледжаную заканадаўствам Рэспублікі Беларусь справаздачнасць і дакументацыю аб сваёй дзейнасці.

Кантроль за дзейнасцю банкаў з удзелам замежных інвестараў праводзіцца Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 14. Уклады замежных інвестараў ва ўстаноўчы фонд прадпрыемства з замежнымі інвестыцыямі

Замежныя інвестары ўносяць уклады ва ўстаноўчы фонд сумеснага прадпрыемства ў якасці замежных інвестыцый у грашовай і неграшовай форме.

Неграшовыя ўклады ацэньваюцца па ўзаемнай дамоўленасці ўдзельнікаў як у замежнай валюце, так і ў валюце, што выкарыстоўваецца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, з улікам цэн, якія склаліся на замежным рынку.

Пераразлік укладаў удзельнікаў у афіцыйную валюту Рэспублікі Беларусь ажыццяўляецца адпаведна ўстаноўленаму курсу абмену валюты, які дзейнічае на дзень падпісання дагавора аб утварэнні прадпрыемства, паводле заканадаўчых актаў, што вызначаюць валютнае рэгуляванне на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

Неграшовы ўклад павінен быць завезены з замежнай краіны або набыты ў Рэспубліцы Беларусь за канверсаваную валюту ці за валюту, якая выкарыстоўваецца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, калі яна атрымана ў Рэспубліцы Беларусь у выглядзе прыбытку ад замежных інвестыцый, дазволенай камерцыйнай дзейнасці, а таксама шляхам абмену канверсаванай валюты ў банках Рэспублікі Беларусь.

Замежны інвестар павінен зрабіць свой грашовы ўзнос ва ўстаноўчы фонд сумеснага прадпрыемства ў канверсаванай валюце, калі нарматыўным актам Рэспублікі Беларусь або заключаным ёю міжнародным дагаворам не прадугледжана іншае. Ён таксама мае права рабіць узнос у валюце, якая прымяняецца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, набытай у парадку, указаным у частцы 4 гэтага артыкула.

Артыкул 15. Ажыццяўленне экспартна-імпартных аперацый

Прадпрыемствы, ва ўстаноўчым фондзе якіх замежныя інвестыцыі складаюць больш за 30 працэнтаў, маюць права без ліцэнзій экспартаваць прадукцыю (работы, паслугі) уласнай вытворчасці. Прадпрыемства з замежнымі інвестыцыямі мае права безліцэнзійна імпартаваць прадукцыю (работы, паслугі) для ўласнай гаспадарчай дзейнасці.

Агульны парадак аднясення прадукцыі (работ, паслуг) да прадукцыі ўласнай вытворчасці прадпрыемстваў з замежнымі інвестыцыямі ўстанаўліваецца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Экспарт і імпарт іншай прадукцыі ажыццяўляецца прадпрыемствамі з замежнымі інвестыцыямі ў адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Парушэнне прадпрыемствам з замежнымі інвестыцыямі палажэнняў частак 1 і 2 гэтага артыкула цягне адказнасць, прадугледжаную заканадаўствам, якое дзейнічае на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 16. Умовы рэалізацыі прадукцыі

Прадпрыемства з замежнымі інвестыцыямі мае права на дагаворнай аснове вызначаць цэны на сваю прадукцыю (работы, паслугі), а таксама парадак яе рэалізацыі і выбіраць пастаўшчыкоў прадукцыі (работ, паслуг).

Артыкул 17. Распараджэнне валютнай выручкай

Валютная выручка ад экспарту ўласнай прадукцыі прадпрыемства з замежнымі інвестыцыямі, у якім доля замежнага ўдзельніка ва ўстаноўчым фондзе перавышае 30 працэнтаў, застаецца ў распараджэнні прадпрыемства за выключэннем сумы падатковых плацяжоў, якія складаюцца ў адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 18. Дагаворы аб аб'ектах інтэлектуальнай уласнасці

Прадпрыемствы з замежнымі інвестыцыямі маюць права заключаць са сваімі работнікамі дагаворы аб аб'ектах інтэлектуальнай уласнасці ў адпаведнасці з вытворчымі заданнямі, пацверджанымі дакументамі прадпрыемства.

Патэнты на вынаходніцтвы і прамысловыя ўзоры выдаюцца прадпрыемству, калі паміж прадпрыемствам і работнікам заключаны адпаведны дагавор. Гэты дагавор, разам з уступкай права на атрыманне патэнта, вызначае абавязкі прадпрыемства па забеспячэнню матэрыяльных, вытворчых і сацыяльных умоў у адносінах да работніка.

Артыкул 19. Выкарыстанне маёмасці па відах абавязацельстваў

Маёмасць прадпрыемства з замежнымі інвестыцыямі можа выкарыстоўвацца ім у якасці забеспячэння па ўсіх відах сваіх абавязацельстваў, уключаючы прыцягненне пазыковых сродкаў.

У якасці забеспячэння могуць выступаць таксама перададзеныя ўдзельнікамі ў кошт укладу ва ўстаноўчы фонд прадпрыемства маёмасныя правы на будынкі, збудаванні, абсталяванне, а таксама іншыя маёмасныя правы.

Закладзеная маёмасць можа быць рэалізавана залогатрымальнікам за валюту, якая выкарыстоўваецца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, і замежную валюту па дагаворных цэнах, у тым ліку на аўкцыёнах.

Артыкул 20. Працоўныя адносіны на прадпрыемствах з замежнымі інвестыцыямі

На прадпрыемствах з замежнымі інвестыцыямі вытворчыя і працоўныя адносіны, уключаючы пытанні найму і звальнення, рэжыму працы і адпачынку, умоў аплаты працы, гарантый і кампенсацый, рэгулююцца як калектыўным дагаворам (пагадненнем), так і індывідуальнымі працоўнымі дагаворамі (кантрактамі).

Пытанні аплаты працы, прадастаўлення адпачынкаў, пенсіённага забеспячэння замежных работнікаў прадпрыемства з замежнымі інвестыцыямі павінны вырашацца ў індывідуальных працоўных дагаворах (кантрактах) з кожным з іх. Іх заработная плата ў замежнай валюце можа пераводзіцца за мяжу.

Умовы калектыўнага дагавору (пагаднення) і індывідуальных працоўных дагавораў не могуць пагаршаць становішча працаўнікоў гэтага прадпрыемства ў параўнанні з умовамі, прадугледжанымі дзеючым заканадаўствам на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 21. Сацыяльнае страхаванне і пенсіённае забеспячэнне асобаў, якія працуюць на прадпрыемствах з замежнымі інвестыцыямі

Сацыяльнае страхаванне працаўнікоў прадпрыемстваў з замежнымі інвестыцыямі і іх сацыяльнае забеспячэнне (за выключэннем пенсіённага забеспячэння замежных працаўнікоў) рэгулююцца заканадаўствам, якое дзейнічае на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

Плацяжы на пенсіённае забеспячэнне замежных працаўнікоў прадпрыемства з замежнымі інвестыцыямі пералічваюцца ў адпаведныя фонды краін іх пастаяннага месца жыхарства на ўмовах і ў парадку, якія прадугледжваюцца ў індывідуальных дагаворах (кантрактах).

Глава III. ДЗЕЙНАСЦЬ ЗАМЕЖНЫХ ІНВЕСТАРАЎ І ПРАДПРЫЕМСТВАЎ З ЗАМЕЖНЫМІ ІНВЕСТЫЦЫЯМІ Ў БАНКАЎСКАЙ І КРЭДЫТНА-ФІНАНСАВАЙ СФЕРАХ. НАБЫЦЦЁ КАШТОЎНЫХ ПАПЕР, УДЗЕЛ У ДЗЕЙНАСЦІ БІРЖ

Артыкул 22. Банкаўскія рахункі прадпрыемстваў з замежнымі інвестыцыямі

Прадпрыемствы з замежнымі інвестыцыямі і замежныя інвестары маюць права адкрываць на тэрыторыі рэспублікі ва ўпаўнаважаных банках рахункі ў замежнай валюце, а таксама ў рублях без права пераводу сум у рублях за мяжу.

Сродкі прадпрыемстваў з замежнымі інвестыцыямі і замежных інвестараў, якія захоўваюцца на іх рахунках, выкарыстоўваюцца для ажыццяўлення імі статутнай дзейнасці, набыцця замежнай валюты па курсах, якія складваюцца ў межах дазволеных форм куплі і продажу валюты на рублі (аўкцыён, біржавы гандаль і іншыя формы). Рублёвыя сумы, якія захоўваюцца на рахунках замежных інвестараў, могуць быць таксама выкарыстаны для мэт прыватызацыі і для закупкі сыравіны, тавараў і паслуг з улікам цэн, якія склаліся на міжнародным рынку, з правам экспарту па спецыяльных ліцэнзіях. Рублёвыя сумы для мэт прыватызацыі могуць быць выкарыстаны толькі у тым выпадку, калі яны атрыманы ў выніку камерцыйна-гаспадарчай дзейнасці на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 23. Укладанне сродкаў у фінансава-крэдытныя ўстановы

Прадпрыемствы з замежнымі інвестыцыямі і замежныя інвестары могуць укладаць сродкі ў сумесныя банкі, страхавыя кампаніі, змешаныя таварыствы і іншыя фінансава-крэдытныя ўстановы, якія ствараюцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь. Доля замежных інвестыцый у вышэйназваных арганізацыях не павінна перавышаць 50 працэнтаў устаноўчага капіталу.

Артыкул 24. Набыццё каштоўных папер і ўдзел у дзейнасці бірж

Прадпрыемствы з замежнымі інвестыцыямі і замежныя інвестары маюць права набываць акцыі, аблігацыі, іншыя каштоўныя паперы, рабіць аперацыі па куплі-продажу замежнай валюты на валютным аўкцыёне, валютнай біржы паводле рыначнага курсу праз ўпаўнаважаныя банкі. Набыццё замежнымі інвестарамі дзяржаўных каштоўных папер ажыццяўляецца ў парадку, які вызначаецца ўпаўнаважаным на тое дзяржаўным органам.

Парадак і ўмовы ўдзелу прадпрыемстваў з замежнымі інвестыцыямі і інвестараў на валютнай, фондавай, таварна-сыравіннай і іншых біржах рэгулюецца адпаведным заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Глава IV. НАБЫЦЦЁ ЗАМЕЖНЫМІ ІНВЕСТАРАМІ І ПРАДПРЫЕМСТВАМІ З ЗАМЕЖНЫМІ ІНВЕСТЫЦЫЯМІ ПРАВОЎ КАРЫСТАННЯ ЗЯМЛЁЙ І ІНШЫМІ МАЁМАСНЫМІ ПРАВАМІ

Артыкул 25. Арэнда маёмасці, зямлі і іншых прыродных рэсурсаў

Прадастаўленне маёмасці, зямлі і іншых прыродных рэсурсаў у арэнду замежным інвестарам і прадпрыемствам з замежнымі інвестыцыямі ажыццяўляецца арэндадаўцамі на падставе дагавораў у адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь «Аб арэндзе» і іншым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь. Прадастаўленне ў арэнду дзяржаўнай маёмасці ажыццяўляецца з дазволу дзяржаўнага органа, упаўнаважанага кіраваць гэтай маёмасцю.

Артыкул 26. Удзел замежных інвестараў у прыватызацыі

Замежныя інвестары маюць права ўдзельнічаць у прыватызацыі аб'ектаў дзяржаўнай уласнасці на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь. Ім даецца права выкупу прадпрыемстваў (долі) пры адмове працоўных калектываў і іншых беларускіх суб'ектаў ад набыцця такіх прадпрыемстваў (долей) у адпаведнасці з праграмай прыватызацыі. Умовы іх удзелу ў конкурсах і аўкцыёнах па прыватызацыі вызначаюцца заканадаўствам, якое дзейнічае на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

Аплата кошту набываемых прадпрыемстваў і аб'ектаў незавершанага капітальнага будаўніцтва або долей удзелу можа праводзіцца як у замежнай валюце, так і ў валюце, якая выкарыстоўваецца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, з улікам цэн міжнароднага рынку. Сумы рахункаў у валюце, якая выкарыстоўваецца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, павінны быць атрыманы ў выніку гаспадарча-камерцыйнай дзейнасці на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 27. Набыццё замежнымі інвестарамі зямельных участкаў ва ўласнасць

Замежныя інвестары маюць права набыць зямельныя ўчасткі ва ўласнасць у парадку і на ўмовах, вызначаных заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 28. Канцэсіі

Прадастаўленне канцэсій на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь знаходзіцца ў выключнай кампетэнцыі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь.

Глава V. ЗАМЕЖНЫЯ ІНВЕСТЫЦЫІ Ў СВАБОДНЫХ ЭКАНАМІЧНЫХ ЗОНАХ

Артыкул 29. Стварэнне свабодных эканамічных зон і дзейнасць у іх

Парадак стварэння свабодных эканамічных зон у Рэспубліцы Беларусь і ажыццяўлення ў іх гаспадарчай дзейнасці з выкарыстаннем замежных інвестыцый і прадастаўляемыя пры гэтым ільготы, уключаючы і па падаткаабкладанню, вызначаюцца адпаведным законам Рэспублікі Беларусь.

Глава VI. ПАДАТКААБКЛАДАННЕ, ПАДАТКОВЫЯ І МЫТНЫЯ ЛЬГОТЫ

Артыкул 30. Падаткі і падатковыя льготы

Прадпрыемствы з замежнымі інвестыцыямі, а таксама замежныя інвестары плацяць падаткі у адпаведнасці з законамі Рэспублікі Беларусь і прадугледжанымі гэтым Законам ільготамі.

Прадпрыемствы, ва ўстаноўчым фондзе якіх доля замежнага інвестара складае больш чым 30 працэнтаў і ўся яго выручка ўтвараецца за кошт рэалізацыі паслуг і прадукцыі ўласнай вытворчасці, вызваляюцца ад платы падатку на прыбытак на працягу трох гадоў з моманту аб'яўлення імі прыбытку, уключаючы першы прыбытковы год.

Калі прадпрыемствы з замежнымі інвестыцыямі вырабляюць асабліва важную для рэспублікі прадукцыю, то Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь мае права згодна з устаноўленым ім спісам паменшыць яшчэ на тэрмін да трох гадоў стаўкі падатку на прыбытак на 50 працэнтаў.

Артыкул 31. Мытнае і падатковае абкладанне ўвозу маёмасці

Маёмасць, сыравіна і матэрыялы, якія ўвозяцца замежным удзельнікам для фарміравання ўстаноўчага фонду прадпрыемства з замежнымі інвестыцыямі, вызваляюцца ад платы мытнай пошліны і не абкладаюцца падаткам на імпарт.

Асабістая маёмасць, якая ўвозіцца ў рэспубліку замежнымі работнікамі прадпрыемстваў з замежнымі інвестыцыямі для асабістых патрэб, вызваляецца ад платы мытнай пошліны.

Артыкул 32. Бухгалтарскі ўлік і статыстычная справаздачнасць прадпрыемства

Прадпрыемствы з замежнымі інвестыцыямі вядуць бухгалтарскі ўлік і статыстычную справаздачнасць па правілах, якія дзейнічаюць у Рэспубліцы Беларусь.

Для мэт балансавай ацэнкі і вядзення рахункаў прадпрыемства з замежнымі інвестыцыямі ажыццяўляе пералік замежнай валюты ў рублі па курсу, устаноўленаму Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь для правядзення адпаведных аперацый.

Артыкул 33. Вызначэнне падаткаў пры ліквідацыі прадпрыемства з замежнымі інвестыцыямі.

Назапашаныя актывы прадпрыемстваў з замежнымі інвестыцыямі, за выключэннем фондаў, сродкі якіх прызначаны для матэрыяльнага заахвочвання і сацыяльна-культурнага развіцця, падлягаюць падаткаабкладанню пры ліквідацыі прадпрыемства паводле іх рэшткавага кошту.

У выпадку ліквідацыі прадпрыемства з замежнымі інвестыцыямі ў перыяд яго вызвалення ад платы падаткаў або на працягу трох гадоў пасля заканчэння тэрміну вызвалення ад платы падаткаў прадпрыемства абавязана выплаціць падатак з прыбытку за той перыяд, на працягу якога яно было вызвалена ад падаткаў.

Глава VII. ГАРАНТЫІ ЗАМЕЖНЫМ ІНВЕСТАРАМ

Артыкул 34. Прававы рэжым замежных інвестыцый

Прававы рэжым замежных інвестыцый на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь не можа быць менш спрыяльны, чым адпаведны рэжым для маёмасці і маёмасных правоў, а таксама інвестыцыйнай дзейнасці беларускіх юрыдычных і фізічных асобаў за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных заканадаўствам, якое дзейнічае на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

У выпадку, калі далейшае заканадаўства Рэспублікі Беларусь пагаршае ўмовы для інвестараў, то да замежных інвестыцый на працягу пяці гадоў прымяняецца заканадаўства, якое дзейнічала на момант ажыццяўлення інвестыцый.

Артыкул 35. Гарантыі ад рэквізіцыі, а таксама незаконных дзеянняў дзяржаўных органаў

Замежныя інвестыцыі ў Рэспубліцы Беларусь не падлягаюць рэквізіцыі або прымяненню мер, роўных па выніках, за выключэннем выпадкаў стыхійных бедстваў, аварый, эпідэмій, эпізаотый і іншых абставін, якія носяць надзвычайны характар.

У выпадку прыняцця органам дзяржаўнага кіравання або мясцовым органам дзяржаўнай улады акта, які не адпавядае закону або парушае правы інвестараў, страты, прычыненыя ім у выніку прыняцця гэтых актаў, кампенсуюцца па рашэнню судоў у адпаведнасці з іх кампетэнцыяй органамі, якія прынялі незаконны акт.

Пры недастатковасці сродкаў у гэтага дзяржаўнага органа страты кампенсуюцца з рэспубліканскага або мясцовага бюджэту.

Сума кампенсацый вызначаецца ў памеры фактычных страт і кампенсуецца інвестару на працягу трох месяцаў у валюце, у якой першапачаткова былі ажыццёўлены інвестыцыі.

Артыкул 36. Гарантыі пераводу даходаў і іншых сум у замежнай валюце

Замежным інвестарам гарантуецца бесперашкодны перавод за мяжу належных ім сум у замежнай валюце.

У выпадку ліквідацыі прадпрыемства замежны інвестар мае права на вяртанне сваёй долі ў маёмасці прадпрыемства ў грашовай або таварнай форме паводле рэшткавага кошту на момант ліквідацыі.

Артыкул 37. Страхаванне маёмасці

Страхаванне маёмасці і рызык прадпрыемства з замежнымі інвестыцыямі ажыццяўляецца па яго меркаванню ў любых арганізацыях, якія ажыццяўляюць страхавыя функцыі на законных падставах, калі заканадаўствам Рэспублікі Беларусь не прадугледжана абвязковае страхаванне.

Глава VIII. ВЫРАШЭННЕ СПРЭЧАК

Артыкул 38. Парадак вырашэння спрэчак

Спрэчкі паміж прадпрыемствам з замежнымі інвестыцыямі і іншымі юрыдычнымі і фізічнымі асобамі, а таксама паміж удзельнікамі такога прадпрыемства па пытаннях, звязаных з яго дзейнасцю, падлягаюць разгляду ў судах Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з іх кампетэнцыяй, або па дамоўленасці бакоў — у трацейскіх судах.

Калі міжнародным дагаворам або міжнародным пагадненнем, у якім удзельнічае Рэспубліка Беларусь, устанаўліваюцца іншыя палажэнні, чым тыя, якія змяшчаюцца ў гэтым Законе, то прымяняюцца палажэнні міжнароднага дагавора або міжнароднага пагаднення.

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь
С. ШУШКЕВІЧ.

14 лістапада 1991 г. гор. Мінск.

Пастанова Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

Аб парадку ўвядзення ў дзеянне Закона Рэспублікі Беларусь «Аб замежных інвестыцыях на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь»

Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь **пастанаўляе:**

1. Увесці ў дзеянне Закон Рэспублікі Беларусь «Аб замежных інвестыцыях на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь» з дня яго апублікавання.

2. Даручыць Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь да 1 лютага 1992 г.:

прывесці рашэнні Урада Рэспублікі Беларусь у адпаведнасць з указаным Законам;

забяспечыць перагляд і адмену міністэрствамі, дзяржаўнымі камітэтамі і ведамствамі Рэспублікі Беларусь, выканкомамі абласных (Мінскага гарадскога) Саветаў народных дэпутатаў іх нарматыўных актаў, у тым ліку інструкцый, якія супярэчаць указанаму Закону;

вызначыць парадак стварэння прадпрыемства, якое цалкам належыць замежнаму інвестару;

пры выкананні пункта 2 Пастановы Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь «Аб прызнанні права прыватнай уласнасці на зямлю на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь» разгледзець парадак і ўмовы набыцця замежнымі інвестарамі ва ўласнасць зямельных участкаў на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь
С. ШУШКЕВІЧ.

14 лістапада 1991 г.
гор. Мінск.

Закон Рэспублікі Беларусь

Аб унясенні дапаўненняў у некаторыя заканадаўчыя акты Рэспублікі Беларусь

У сувязі з прыняццем Закона Рэспублікі Беларусь «Аб міліцыі» Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь **пастанаўляе:**

Унесці наступныя дапаўненні ў заканадаўчыя акты Рэспублікі Беларусь:

1. У Крымінальна-працэсуальны кодэкс Рэспублікі Беларусь, зацверджаны Законам Рэспублікі Беларусь 29 снежня 1960 года (ЗЗ БССР, 1961 г., № 1, арт. 5):

дапоўніць Кодэкс артыкулам 170^1 наступнага зместу:

«Артыкул 170^1. Рэчавыя доказы, адабраныя ў ходзе затрымання або асабістага вобыску затрыманага на месцы злачынства

Прадметы і дакументы, указаныя ў артыкуле 78 гэтага Кодэкса, адабраныя ў ходзе затрымання або асабістага вобыску затрыманага на месцы злачынства, калі немагчыма забяспечыць прысутнасць панятых, прызнаюцца доказамі, атрыманымі ва ўстаноўленым законам парадку.

Аб адабранні ў гэтых выпадках рэчавых доказаў складаецца пратакол у парадку, устаноўленым артыкулам 175 гэтага Кодэкса»;

артыкул 171 дапоўніць часткай чацвёртай наступнага зместу:

«У выпадках затрымання асобы на месцы злачынства, калі немагчыма забяспечыць прысутнасць панятых, дапускаецца правядзенне асабістага вобыску без іх удзелу».

II. У Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях, прыняты Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь 6 снежня 1984 года (ЗЗ БССР, 1984 г., № 35, арт. 505): дапоўніць Кодэкс артыкулам 231^1 наступнага зместу: «Артыкул 231^1. Рэчавыя доказы, адабраныя ў ходзе адміністрацыйнага затрымання або асабістага надгляду затрыманага на месцы правапарушэння

Прадметы і дакументы, адабраныя службовымі асобамі ўпаўнаважаных на тое органаў у ходзе адміністрацыйнага затрымання або асабістага надгляду затрыманага на месцы правапарушэння, калі немагчыма забяспечыць прысутнасць панятых, прызнаюцца рэчавымі доказамі, атрыманымі ва ўстаноўленым законам парадку»;

частку другую артыкула 243 дапоўніць словамі «за выключэннем выпадкаў, калі немагчыма забяспечыць прысутнасць панятых (артыкул 231^1 гэтага Кодэкса)».

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь
С. ШУШКЕВІЧ.

14 лістапада 1991 г. гор. Мінск.

Народная газета

ПАСТАНОВА

Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у некаторыя заканадаўчыя акты Рэспублікі Беларусь, якія рэгулююць пытанні аднаўлення правоў грамадзян, пацярпеўшых ад рэпрэсій у 20—80-я гады

Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь **пастанаўляе:**

Унесці змяненні і дапаўненні ў наступныя заканадаўчыя акты Рэспублікі Беларусь:

1. Палажэнне аб парадку аднаўлення правоў грамадзян, якія пацярпелі ад рэпрэсій у 20—50-х гадах, зацверджанае пастановай Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь ад 21 снежня 1991 года (Ведамасці Вярхоўнага Савета Беларускай ССР, 1991 г., № 1(3), арт. 3);

пункт 4 дапоўніць абзацам трэцім наступнага зместу:

«У такім жа парадку разглядаюцца і вырашаюцца заявы грамадзян аб пакрыцці страты, у якіх у працэсе раскулачвання была адабрана маёмасць, але яны самі не падвяргаліся высяленню за межы рэспублікі»;

пункт 20 дапоўніць абзацам другім наступнага зместу:

«Аднаўленне правоў, пакрыццё страты і прадастаўленне льгот рэабілітаваным асобам праводзяцца незалежна ад часу іх рэабілітацыі, але з улікам выплат кампенсацый, праведзеных раней»;

у назве і тэксце пастановы Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь «Аб зацвярджэнні Палажэння аб парадку аднаўлення правоў грамадзян, якія пацярпелі ад рэпрэсій у 20—50-х гадах» і Палажэння словы «20—50-я гады» замяніць словамі «20—80-я гады».

2. Пастанову Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь ад 6 чэрвеня 1991 года «Аб парадку рэабілітацыі ахвяр палітычных рэпрэсій 20—50-х гадоў у Рэспубліцы Беларусь» (Ведамасці Вярхоўнага Савета Беларускай ССР, 1991 г., № 23, арт. 325):

падпункт «в» пункта 2 дапоўніць словамі «...а таксама сяляне, у тым ліку прызнаныя кулакамі, асуджаныя за няплату павышаных падаткаў і адмову ад выканання павіннасцей і работ, якія маюць агульнадзяржаўнае значэнне па артыкулу 93 і артыкулу 94 Крымінальнага кодэкса БССР 1928 года»;

пункт 2 дапоўніць падпунктам «г» наступнага зместу:

«г) асобы, незаконна змешчаныя па рашэннях судоў у псіхіятрычныя ўстановы на прымусовае лячэнне ў сувязі з узбуджэннем крымінальных спраў.

Рэабілітаваць асоб, асуджаных у перыяд з 1960 па 1988 гады па палітычных матывах за злачынствы, адказнасць за якія была адменена далейшым заканадаўствам, або незаконна змешчаных па рашэннях судоў ў псіхіятрычныя ўстановы на прымусовае лячэнне ў сувязі з узбуджэннем крымінальных спраў»;

пункт 6 пасля абзаца другога дапоўніць абзацамі наступнага зместу:

«Рэабілітаваныя асобы, а з іх згоды або ў выпадку смерці апошніх — іх сваякі маюць права на азнаямленне з матэрыяламі крымінальных і адміністрацыйных спраў. Азнаямленне іншых асоб з указанымі матэрыяламі праводзіцца ў парадку, устаноўленым для азнаямлення з матэрыяламі дзяржаўных архіваў. Выкарыстанне атрыманых звестак на шкоду правам і законным інтарэсам праходзячых па справе асоб і іх сваякоў не дапускаецца і праследуецца ва ўстаноўленым законам парадку.

Дазвол на азнаямленне з матэрыяламі крымінальных і адміністрацыйных спраў, а таксама на вяртанне далучаных да справы асабістых дакументаў дае кіраўнік органа, які ажыццяўляе архіўнае захоўванне спраў, а пры знаходжанні спраў у вядзенні ў органах пракуратуры або суда — кіраўнік органа, у вядзенні якога справа знаходзіцца на момант звароту.

Адмова ў азнаямленні са справай або ў выдачы матэрыялаў з яе, атрыманая ад кіраўніка органа, што ажыццяўляе архіўнае захоўванне спраў, можа быць абскарджана ў парадку, устаноўленым для абскарджання неправамерных дзеянняў службовай асобы, якая ўшчамляе правы грамадзян, а адмова кіраўніка органа пракуратуры або суда — у вышэйстаячую пракуратуру або суд адпаведна.

Органы дзяржаўнай бяспекі, унутраных спраў і пракуратуры абавязаны аказваць садзейнічанне сваякам і грамадскім аб'яднанням грамадзян па выяўленню месцаў пахавання асоб, расстраляных і памёршых у месцах пазбаўлення волі»;

у назве і тэксце пастановы Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь «Аб парадку рэабілітацыі ахвяр палітычных рэпрэсій 20—50-х гадоў у Рэспубліцы Беларусь» словы «20—50-х гадоў» замяніць словамі «20—80-х гадоў».

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь
С. ШУШКЕВІЧ.

1 лістапада 1991 г.
гор. Мінск.

Пастанова Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

Аб зацвярджэнні Палажэння аб Камісіі пры Вярхоўным Савеце Рэспублікі Беларусь па аказанню садзейнічання ў забеспячэнні правоў ахвяр палітычных рэпрэсій 20—80-х гадоў і ўвекавечанні іх памяці

Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь **пастанаўляе:**

1. Перайменаваць Камісію пры Вярхоўным Савеце Рэспублікі Беларусь па аказанню садзейнічання ў забеспячэнні правоў ахвяр палітычных рэпрэсій 20—50-х гадоў і ўвекавечанні іх памяці ў Камісію пры Вярхоўным Савеце Рэспублікі Беларусь па аказанню садзейнічання ў забеспячэнні правоў ахвяр палітычных рэпрэсій 20—80-х гадоў і ўвекавечанні іх памяці.

2. Зацвердзіць Палажэнне аб Камісіі пры Вярхоўным Савеце Рэспублікі Беларусь па аказанню садзейнічання ў забеспячэнні правоў ахвяр палітычных рэпрэсій 20—80-х гадоў і ўвекавечанні іх памяці (прыкладаецца).

3. Прызнаць страціўшымі сілу:

Пастанову ЦК КПБ і Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь ад 8 лютага 1989 года «Аб утварэнні пры Вярхоўным Савеце Рэспублікі Беларусь і мясцовых Саветах народных дэпутатаў камісій па аказанню садзейнічання ў забеспячэнні правоў і інтарэсаў рэабілітаваных і па ўвекавечанню памяці ахвяр рэпрэсій, якія мелі месца ў перыяд 30—40-х і пачатку 50-х гадоў» (ЗЗ БССР, 1989 г.,№ 7, арт. 64);

Пастанову Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь ад 29 ліпеня 1989 года «Аб утварэнні пры Вярхоўным Савеце Рэспублікі Беларусь Камісіі па аказанню садзейнічання ў забеспячэнні правоў і інтарэсаў рэабілітаваных і ўвекавечанні памяці ахвяр рэпрэсій, меўшых месца ў перыяд 30-х — 40-х і пачатку 50-х гадоў, і аб зацвярджэнні Палажэння аб гэтай Камісіі» (ЗЗ БССР, 1989 г., № 22, арт. 217).

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь
С. ШУШКЕВІЧ.

1 лістапада 1991 г.
гор. Мінск.

Зацверджана пастановай Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь ад 1 лістапада 1991 г.

ПАЛАЖЭННЕ

аб Камісіі пры Вярхоўным Савеце Рэспублікі Беларусь па аказанню садзейнічання ў забеспячэнні правоў ахвяр палітычных рэпрэсій 20—80-х гадоў і ўвекавечанні іх памяці

1. Камісія пры Вярхоўным Савеце Рэспублікі Беларусь займаецца пытаннямі аказання садзейнічання ў аднаўленні і практычнай рэалізацыі правоў ахвяр палітычных рэпрэсій 20 — 80-х гадоў і ўвекавечанні іх памяці.

Дзейнасць Камісіі ажыццяўляецца публічна, пры шырокім удзеле грамадскіх арганізацый, а таксама асацыяцый, іх аддзяленняў, саветаў, пярвічных груп, якія аб'ядноўваюць асоб, пацярпеўшых ад неабгрунтаваных рэпрэсій.

2. Камісія ўтвараецца з ліку народных дэпутатаў, работнікаў міністэрстваў і ведамстваў, якія займаюцца забеспячэннем правоў рэабілітаваных, праваахоўных органаў, прадстаўнікоў грамадскасці, а таксама грамадзян, якія падвергліся палітычным рэпрэсіям.

Каміся ўтвараецца Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь у складзе старшыні і членаў Камісіі.

Намеснік старшыні Камісіі і яе сакратар выбіраюцца на пасяджэнні Камісіі з наступным зацвярджэннем Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь.

3. Камісія ў сваёй рабоце кіруецца заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь і СССР, што дзейнічаюць на тэрыторыі рэспублікі, пастановамі ўрада Рэспублікі Беларусь, іншымі нарматыўнымі актамі, якія адносяцца да яе дзейнасці, а таксама гэтым Палажэннем.

4. Камісія:

— ажыццяўляе падрыхтоўку праектаў нарматыўных актаў (законаў, пастаноў) і іншых дакументаў, якія датычацца рэабілітацыі ахвяр палітычных рэпрэсій 20 — 80-х гадоў, аднаўлення і забеспячэння законных правоў і інтарэсаў рэабілітаваных грамадзян;

— вывучае пытанні, якія адносяцца да рэабілітацыі ахвяр неабгрунтаваных рэпрэсій, аналізуе гэту работу і ўносіць адпаведныя прапановы;

— арганізуе сумесна з выканкамамі мясцовых Саветаў народных дэпутатаў і архіўнымі ўстановамі персанальны ўлік асоб, пацярпеўшых у ходзе палітычных рэпрэсій;

— каардынуе работу дзяржаўных органаў, грамадскіх арганізацый і аб'яднанняў па пытаннях, звязаных з рэабілітацыяй ахвяр рэпрэсій, аднаўленнем правоў рэабілітаваных, увекавечаннем іх памяці;

— прымае прапановы дзяржаўных органаў, грамадскіх арганізацый і аб'яднанняў, прадпрыемстваў, устаноў і грамадзян па ўвекавечанню памяці ахвяр рэпрэсій і дае па іх свае рэкамендацыі;

— разглядае пісьмы, заявы і скаргі рэпрэсіраваных асоб і іх сваякоў па пытаннях рэабілітацыі, аднаўлення працоўных, жыллёвых, пенсіённых і іншых правоў гэтых грамадзян, а таксама кампенсавання прычыненага ім маёмаснага і іншага ўрону ў адпаведнасці с дзеючым заканадаўствам, аказвае садзейнічанне ў іх правільным вырашэнні, арганізуе асабісты прыём грамадзян членамі Камісіі;

— садзейнічае зацікаўленым установам і арганізацыям, а таксама грамадзянам у атрыманні матэрыялаў аб службовым і грамадскім становішчы рэабілітаваных да арышту, іх заслугах перад дзяржавай;

— аказвае неабходную дапамогу грамадзянам у атрыманні дакументаў, звязаных з іх рэабілітацыяй і кампенсаваннем ім маёмаснага і іншага ўрону;

— выказвае адпаведным органам сваё меркаванне па спрэчных пытаннях, якія ўзнікаюць у грамадзян у сувязі з рэабілітацыяй;

— запытвае ў неабходных выпадках ад праваахоўных і іншых органаў звесткі, звязаныя з вырашэннем тых або іншых пытанняў, якія датычацца рэабілітаваных асоб;

— дае рэкамендацыі савецкім і гаспадарчым органам па пытаннях, звязаных з аднаўленнем правоў і законных інтарэсаў рэабілітаваных грамадзян;

— заслухоўвае паведамленні адпаведных службовых асоб аб ходзе выканання патрабаванняў заканадаўства па рэабілітацыі ахвяр рэпрэсій, кампенсацыі ім матэрыяльнага ўрону, а таксама па аказанню іншай неабходнай дапамогі рэабілітаваным;

— падтрымлівае пастаянную сувязь з адпаведнымі камісіямі пры абласных, Мінскім гарадскім і раённых Саветах народных дэпутатаў, аказвае практычную дапамогу ў іх рабоце;

— кантралюе пытанні падрыхтоўкі і выпуску спецыяльнага выдання з мэтай увекавечання памяці ахвяр рэпрэсій, а таксама публікацыі спісаў рэабілітаваных грамадзян у мясцовых газетах і Кнігах памяці.

5. Пасяджэнні Камісіі склікаюцца па меры неабходнасці і правамоцныя, калі на іх прысутнічае больш палавіны яе складу. Усе пытанні ў Камісіі вырашаюцца простай большасцю галасоў прысутнічаючых на яе пасяджэнні членаў, пасяджэнні афармляюцца пратаколамі, якія падпісваюцца старшынёй Камісіі або яго намеснікам.

У пасяджэннях Камісіі могуць прымаць удзел прадстаўнікі сродкаў масавай інфармацыі, работнікі дзяржаўных і праваахоўных органаў, грамадскіх арганізацый і аб'яднанняў, якія маюць непасрэдныя адносіны да пытання, што абмяркоўваецца.

У неабходных выпадках Камісія можа прыцягваць да сваёй работы прадстаўнікоў навуковых і іншых устаноў, спецыялістаў розных галін ведаў.

6. Пытаннямі забеспячэння практычнай дзейнасці Камісіі займаецца старшы рэферэнт, справаводства вядзецца інспектарам.

7. Матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне Камісіі ажыццяўляецца Сакратарыятам Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь.

Закон Рэспублікі Беларусь

Аб прызнанні страціўшымі сілу некаторых заканадаўчых актаў Рэспублікі Беларусь

У сувязі з прыняццем Закона Рэспублікі Беларусь «Аб мясцовым самакіраванні і мясцовай гаспадарцы ў Рэспубліцы Беларусь» Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь пастанаўляе:

Прызнаць страціўшымі сілу:

Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь ад 11 снежня 1984 года «Аб аддзелах і ўпраўленнях выканаўчых камітэтаў абласных, раённых, гарадскіх, раённых у гарадах Саветаў народных дэпутатаў Рэспублікі Беларусь» (ЗЗ БССР, 1984 г., № 35, арт. 514);

Закон Рэспублікі Беларусь ад 28 сакавіка 1985 года «Аб зацвярджэнні Указа Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь «Аб аддзелах і ўпраўленнях выканаўчых камітэтаў абласных, раённых, гарадскіх, раённых у гарадах Саветаў народных дэпутатаў Рэспублікі Беларусь» (ЗЗ БССР, 1985 г., № 10, арт. 149);

атрыкул 6 Указа Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь ад 24 ліпеня 1987 года «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у заканадаўчыя акты Рэспублікі Беларусь па пытаннях дзяржаўнага арбітражу» (ЗЗ БССР, 1987 г., № 21, арт. 268);

Закон Рэспублікі Беларусь ад 30 кастрычніка 1987 года «Аб зацвярджэнні ўказаў Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у некаторыя заканадаўчыя акты Рэспублікі Беларусь» у частцы зацвярджэння артыкула 6 Указа Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь ад 24 ліпеня 1987 года «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у заканадаўчыя акты Рэспублікі Беларусь па пытаннях дзяржаўнага арбітражу» (ЗЗ БССР, 1987 г., № 31, арт. 412);

Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь ад 9 сакавіка 1988 года «Аб унясенні змянення ва Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь «Аб аддзелах і ўпраўленнях выканаўчых камітэтаў абласных, раённых, гарадскіх, раённых у гарадах Саветаў народных дэпутатаў Рэспублікі Беларусь» (ЗЗ БССР, 1988 г., № 8, арт. 125);

Закон Рэспублікі Беларусь ад 8 красавіка 1988 года «Аб зацвярджэнні ўказаў Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у некаторыя заканадаўчыя акты Рэспублікі Беларусь» у частцы зацвярджэння Указа Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь ад 9 сакавіка 1988 года «Аб унясенні змянення ва Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь «Аб аддзелах і ўпраўленнях выканаўчых камітэтаў абласных, раённых, гарадскіх, раённых у гарадах Саветаў народных дэпутатаў Рэспублікі Беларусь» (ЗЗ БССР, 1988 г., № 11, арт. 177).

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь
С. ШУШКЕВІЧ.

14 лістапада 1991 г.
гор. Мінск.

ЗВАРОТ

Да грамадзянаў Рэспублікі Беларусь

Паважаныя грамадзяне Беларусі!

Апошнім часам ідуць спробы былых партапаратчыкаў рэанімаваць КПСС на Беларусі. Былымі функцыянерамі КПБ створаны і працуе так званы Ініцыятыўны камітэт па аднаўленьню дзейнасьці Кампартыі Беларусі і яе абнаўленьню. Парушаючы пастанову Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь ад 25 жніўня, не зважаючы на папярэджваньні Пракуратуры Беларусі, яны праводзяць сходы, вылучаюць дэлегатаў і рыхтуюць зьезд КПБ. Хаваючыся пад лозунгамі барацьбы за сацыяльную справядлівасьць, прысвойваючы сабе права гаварыць ад імя працоўных, яны зноў, як і ў 17-м годзе, спрабуюць увесьці народ у зман.

Каб дасягнуць сваіх мэтаў, камуністы сьпекулююць на цяжкім эканамічным становішчы, да якога яны самі давялі Беларусь. Гэтыя мэты — зусім не барацьба за «сьветлую будучыню», якую 74 гады абяцала нам камуністычная ідэалогія, зусім не сацыяльная справядлівасьць, аб якой камуністы гавораць цяпер. Карыстаючыся неабмежаванай уладай, камуністы мелі ўсе магчымасьці, каб зьдзейсьніць гэтыя абяцаньні. Маюць яны іх і зараз, бо ўся ўлада, нягледзячы на прыпыненьне дзейнасьці КПБ—КПСС на тэрыторыі Беларусі, знаходзіцца ў руках камуністычнай наменклатуры. Мэты беларускіх камуністаў зусім іншыя.

Сёньня, адчуваючы, што крэслы пад імі хістаюцца, партыйныя наменклатуршчыкі прагнуць ўратаваць нарабаваныя ў народа за гады свайго панаваньня мільярды. Мы яшчэ не ведаем, колькі грошай знаходзіцца на партыйных рахунках, бо амаль кожны дзень зьяўляюцца зьвесткі аб новых партыйных мільярдах у нашых і замежных банках. Камуністы шукаюць спосаб, як прыбраць гэтыя грошы ў сваю прыватную ўласнасьць. Іх мэта — увайсьці ў рынак, валодаючы мільярдамі, каб мы ізноў вымушаны былі наймацца да іх на працу, прадаючы свае рабочыя рукі і інтэлект.

Зараз яны сьпяшаюцца правесьці свой зьезд, каб абвясьціць аб стварэньні КПБ, якая дагэтуль юрыдычна не была аформлена, і стаць правапераемнікамі маёмасьці забароненай партыі. Па папярэдніх зьвестках, гэты зьезд рыхтуецца на канец лістапада — пачатак сьнежня. Камуністы ведаюць, што калі яны не зарэгіструюць сваю «новую» партыю да 1 студзеня, тады, згодна з законам, гэтыя мільярды пяройдуць беларускай дзяржаве.

Мы ўсе таксама павінны гэта ведаць. І мы павінны зрабіць усё магчымае, каб гэтае новае ашуканства бальшавікоў не зьдзейсьнілася. Мы лічым, што нельга больш цярпець камуністычнага хітраваньня і зьдзеку над нашым грамадзтвам. Ні зямля, ні ўласнасьць так і ня вернуты народу. Зьніклі тавары першай неабходнасьці. З-за злачыннага бязьдзеяньня камуністычнага ўраду і камуністычнага Вярхоўнага Савета нішчыцца наш рынак, вывозяцца тавары і прадукты. А ў гэты час зноў на Беларусі ўзьнікае прывід камунізму, зноў хоча распаўсюдзіцца чырвоная бальшавіцкая чума.

Управа Беларускага Народнага Фронту «Адраджэньне», кіраўніцтва рабочых страйкамаў, аб'яднанай Дэмакратычнай партыі Беларусі, Беларускай Сялянскай партыі, Беларускай Сацыял-Дэмакратычнай Грамады, Нацыянал-Дэмакратычнай партыі Беларусі, Беларускай Хрысьціянска-Дэмакратычнай Злучнасьці заклікаюць усё дэмакратычнае насельніцтва Рэспублікі Беларусь не дапусьціць незаконнага аднаўленьня дзейнасьці злачыннай арганізацыі КПБ—КПСС. Заклікаем прыхільнікаў БНФ, рабочага руху, усіх дэмакратычных і некамуністычных партыяў ва ўсіх гарадах і вёсках Беларусі прыехаць на месца, дзе адбудзецца зьезд камуністаў (аб даце і месцы зьезду будзе паведамлена), каб выказаць самы рашучы пратэст супраць аднаўленьня незаконнай дзейнасьці злачынных структураў КПСС на Беларусі.

Мы зьвяртаем увагу мясцовых органаў улады на тое, што любая падтрымка ці спрыяньне правакацыйным дзеяньням камуністаў зьяўляецца супрацьзаконнай і можа выклікаць справядлівае абурэнне грамадзянаў Рэспублікі Беларусь. Адказнасьць за магчымыя наступствы ў гэтым выпадку кладзецца на тых, хто дазволіў правядзеньне гэтага сходу.

Управа БНФ «Адраджэньне», кіраўніцтва рабочых страйкамаў, АДПБ, БСП, БСДГ, НДПБ, БХДЗ.

ЗАЯВА

выканкама Цэнтральнай Рады Беларускай Сацыял-Дэмакратычнай Грамады па праблеме раздзяржаўлення і прыватызацыі

Кіруючыся праграмнай заявай БСДГ і разумеючы, што неабходна паскорыць эканамічныя пераўтварэнні ў народнай гаспадарцы Рэспублікі Беларусь, каб пераадолець крызіс у эканоміцы і вывесці яе на нармальны шлях далейшага развіцця, выканкам Цэнтральнай Рады БСДГ разглядае раздзяржаўленне народнай гаспадаркі як праблему даўно наспелую і неадкладную. Толькі праз раздзяржаўленне можна пазбавіцца манапалізму ў эканоміцы, які прывёў да затухання гаспадарчай дзейнасці і своеасаблівага яе паралічу на Беларусі і ў былым Саюзе.

Сусветны вопыт сведчыць, што раздзяржаўленне можна ажыццявіць толькі праз перадачу дзяржаўнай маёмасці ў рукі непасрэдных вытворцаў— калектываў, кааператываў, асацыяцый і прыватных асоб. Гэта будзе служыць станаўленню змешанай эканомікі, эфектыўнасць якой даказана ў шматлікіх краінах свету. Раздзяржаўленне мае дзве ўзаемаабумоўленыя задачы. Адна з іх — праз прыватную, групапрыватную, калектыўна-прыватную ўласнасць абудзіць прадпрымальніцкі дух народа, творчую ініцыятыву, працавітасць і адказнасць працаўнікоў за вынікі сваёй працы; другая — дасягненне сацыяльнай справядлівасці. Кожны грамадзянін Рэспублікі Беларусь павінен атрымаць сваю законную долю таго багацця, якое набыта дзяржавай за кошт яго працы.

Галоўны напрамак раздзяржаўлення — прыватызацыя. Яе трэба паскараць, але не спяшаючыся. Трэба правесці вялікую галосную падрыхтоўку да гэтага працэсу, а менавіта:

1. Зрабіць інвентарызацыю і эканамічную ацэнку ўсіх асноўных і абаротных фондаў у народнай гаспадарцы рэспублікі, уключаючы і эканамічную ацэнку зямлі. Ацэнку неабходна зрабіць у доларах, рублях і тых грошах, якія будуць уведзены ў рэспубліцы, з улікам іх валютнага курсу.

2. Ажыццявіць перапіс працаздольнага насельніцтва і пенсіянераў — грамадзян Рэспублікі Беларусь з улікам працоўнага стажу і ўкладу ў народную скарбонку.

3. Вызначыць долю ўласнасці і сферы народнай гаспадаркі, якія не падлягаюць прыватызацыі.

4. Навукова ўстанавіць, якую частку належачай да прыватызацыі ўласнасці перадаць народу бясплатна ў выглядзе каштоўных папер з правам прысваення часткі будучага прыбытку, а якую — за выкуп.

5. Правесці грашовую рэформу (увесці грошы Рэспублікі Беларусь), без якой народнае дабро паплыве не ў рукі рабочых, сялян і інтэлігенцыі, а да махляроў і здабытчыкаў грошай не толькі з ліку грамадзян Рэспублікі Беларусь, але і іншых дзяржаў, дзе ўводзяцца свае грошы і існуе імкненне «сплавіць драўляныя грошы» на Беларусь, якая і да гэтага часу аніяк не абаронена ад валютнай інтэрвенцыі.

6. Заканадаўча размеркаваць уласнасць на дзяржаўную (усёй рэспублікі) і муніцыпальную (абласцей, гарадоў, раёнаў, гарадскіх пасёлкаў і г. д.). Да прыватызацыі муніцыпальнай уласнасці трэба падыходзіць вельмі асцярожна. Напрыклад, ці мае сэнс прыватызаваць зямлю і нежылы фонд, што знаходзяцца ў камунальнай (муніцыпальнай) уласнасці?

Выканкам БСДГ заяўляе пратэст супраць явачнай, падзаконнай (названай у народзе «дзікай») прыватызацыі ў адпаведнасці з «Часовым парадкам раздзяржаўлення эканомікі і прыватызацыі дзяржаўнай уласнасці Рэспублікі Беларусь», зацверджаным пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 23 верасня 1991 года № 360. Гэтая пастанова ёсць ні што іншае як спроба былой наменклатуры цішком расцягнуць народнае дабро, а працоўных пакінуць ні з чым. Стыхійная прыватызацыя павінна быць прыпынена, а ўказаная пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь неадкладна адменена.

Выканкам БСДГ лічыць, што, прыступаючы да прыватызацыі, неабходна мець дакладны механізм і формы яе правядзення, што, прызнаючы прыярытэт працоўных калектываў, перадаць ім пры стварэнні акцыянерных форм вытворчасці, што пусціць праз фондавыя біржы па курсу акцый, якую частку можна прадаць грамадзянам іншых дзяржаў. Дзеля гэтага Закон «Аб грамадзянстве Рэспублікі Беларусь», не ў прыклад Закону аб дзяржаўнай мове, трэба неадкладна ўвесці ў дзеянне. Прамаруджванне адгукнецца складанымі праблемамі.

Улічваючы, што квота на жыллё ў законапраекце «Аб прыватызацыі жыллёвага фонду ў Рэспубліцы Беларусь» была ўстаноўлена з улікам пажаданняў былых партыйна-дзяржаўных колаў, якія не крыўдзяць сябе пры яго размеркаванні, забываючы рабочы люд, гэтую квоту трэба вывучыць, перагледзець у бок змяншэння, каб мець магчымасць кампенсаваць тых грамадзян, якія знаходзяцца ў дрэнных жыллёвых умовах або зусім не маюць жылля. З улікам вопыту іншых еўрапейскіх, асабліва ўсходнееўрапейскіх, краін трэба распрацаваць падыходы да перадачы дзяржаўнай маёмасці, перш за ўсё прадпрыемстваў гандлю, абслугі і г. д., прыватным асобам або сем'ям.

Выканкам БСДГ лічыць, што, бадай, самай складанай і адказнай праблемай з'яўляецца прыватызацыя зямлі. Надзяленне зямлёй і неабходнымі сродкамі вытворчасці будучых фермераў павінна адбывацца як на бясплатнай аснове, так і на аснове выкупу з мэтаю стварэння таварных гаспадарак. Трэба вызначыць як мінімальныя памеры зямельных надзелаў, так і максімальныя, не дапусціць размеркавання зямлі па колькасці едакоў, бо гэта будзе крок да ўзроўню 20-х гадоў. Усе адпрацаваўшыя на зямлі сяляне павінны атрымаць або кампенсацыю за зямлю, якую яны не могуць узяць для апрацоўкі, або—па іх жаданню — невялікія надзелы для пракармлення ў дадатак да пенсіі.

З улікам сучасных эканамічных варункаў і глыбокага аграрнага крызісу не можа ставіцца пытанне аб прыватызацыі рэнтабельных і высокарэнтабельных калгасаў і саўгасаў. Яны павінны быць арганізацыйна перабудаваны і прыстасаваны да рыначных адносін. Іх лёс у далейшым вырашаць самі сяляне. Што да прыватызацыі калгасаў і саўгасаў, якія церпяць банкруцтва пры адмене цяжкіх для грамадства датацый, то пры прыватызацыі не павінны нішчыцца фермы, двары, майстэрні, склады, ёмістасці для паліва і г. д. Усе яны павінны быць прыстасаваны для абслугоўвання фермерскіх гаспадарак, стаць элементамі новай вытворчай інфраструктуры.

Ведаючы пра абмежаванасць крыніц прыватызацыі, выканкам БСДГ лічыць, што ні частка прыбытку для пашырэння вытворчасці (бо пры арганізацыйнай перабудове яе неабходна толькі павялічыць), ні сродкі амартызацыйных адлічэнняў, прызначэнне якіх — рэнавацыя, ні заработная плата, узровень якой быў і ёсць жабрачы, не могуць быць крыніцай прыватызацыі. Выйсце адно: выкарыстоўваць для прыватызацыі зберажэнні працоўных, іпатэчны і камерцыйны крэдыт, а таксама тую частку прыбытку, якая належыць да размеркавання па акцыях і іншых каштоўных паперах.

По горячим следам

Коммунисты, назад! В окопы!

Тревожную телеграмму получила недавно «Народная газета» от координационного совета Бешенковичского отделения Объединенной демократической партии Беларуси.

Бешенковичские демократы с возмущением сообщили, что несколько дней назад вопреки постановлению Верховного Совета республики о временном приостановлении деятельности КПБ—КПСС местные коммунисты провели в зале заседаний райисполкома собрание, на котором избрали двух делегатов на съезд возрождаемой КПБ.

Прокомментировать этот факт мы попросили Генерального прокурора Республики Беларусь Николая Игнатовича:

— Аналогичную телеграмму из Бешенковичей получил и я. Более того, по нашим сведениям, подобные оргсобрания коммунистов прошли уже примерно в двадцати районах республики. Всем инициаторам таких мероприятий на первый раз вынесены прокурорские предостережения. В случае же дальнейшего игнорирования решения парламента Беларуси организаторы возрождения структур КПБ будут наказаны в административном порядке.

Кстати, намечавшийся на сегодня в Доме культуры «Минскпромстроя» съезд «старых-новых» коммунистов переносится на 14—15 декабря. Инициаторы созыва форума новой политической партии социалистической ориентации (именно так предпочитают сейчас именовать реанимируемую КПБ ее спасители) решили все-таки прекратить «шутки» с законодателями и подождать, какой вердикт вынесет Компартии Беларуси сессия Верховного Совета республики, которая начнет работу 10 декабря.

Итак, коммунисты республики вернулись в окопы. Выйдут они оттуда с пением «Интернационала» или же с поднятыми руками, теперь во многом будет зависеть от белорусского парламента.

Николай ДЕБЕЛО.

Закон Рэспублікі Беларусь

Аб прызнанні страціўшымі сілу некаторых заканадаўчых актаў Рэспублікі Беларусь

У адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь «Аб мерах прымусовага ўздзеяння ў адносінах да хранічных алкаголікаў і наркаманаў, якія сістэматычна парушаюць грамадскі парадак або правы іншых асоб» Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь **пастанаўляе:**

Прызнаць страціўшымі сілу:

Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь ад 1 верасня 1959 года «Аб узмацненні барацьбы з п'янствам і самагонаварэннем» (ЗЗ БССР, 1959 г., №11, арт. 206);

Закон Рэспублікі Беларусь ад 20 лістапада 1959 года «Аб зацвярджэнні Указа Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь «Аб узмацненні барацьбы з п'янствам і самагонаварэннем» (ЗЗ БССР, 1959 г., № 16. арт. 262);

Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь ад 1 жніўня 1974 года «Аб прымусовым лячэнні і працоўным перавыхаванні хранічных алкаголікаў» (ЗЗ БССР, 1974 г., № 35, арт. 577; 1982 г., № 36, арт. 673; 1985 г., № 32, арт. 449; 1986 г., № 28, арт. 429);

Палажэнне аб лячэбна-працоўных прафілакторыях для хранічных алкаголікаў, зацверджанае Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь ад 1 жніўня 1974 года (Ведамасці Вярхоўнага Савета Беларускай ССР, 1991 г., дадатак да № 6 (8);

Пастанова Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь ад 1 жніўня 1974 года «Аб парадку прымянення Указа Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь ад 1 жніўня 1974 года «Аб прымусовым лячэнні і працоўным перавыхаванні хранічных алкаголікаў» (Ведамасці Вярхоўнага Савета Беларускай ССР, 1991 г., дадатак да № 6 (3));

Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь ад 31 кастрычніка 1974 года «Аб прымусовым лячэнні і працоўным перавыхаванні хворых наркаманіяй» (ЗЗ БССР, 1974 г., № 31, арт. 497; 1986 г., № 28, арт. 364; 1987 г., № 22, арт. 282);

Палажэнне аб лячэбна-працоўных прафілакторыях для хворых наркаманіяй, зацверджанае Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь ад 31 кастрычніка 1974 года (Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, 1991 г., дадатак да № 6(8));

Пастанова Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь ад 31 кастрычніка 1974 года «Аб парадку прымянення Указа Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь ад 31 кастрычніка 1974 года «Аб прымусовым лячэнні і працоўным перавыхаванні хворых наркаманіяй» (Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, 1991 г., дадатак да № 6 (8));

Закон Рэспублікі Беларусь ад 25 снежня 1974 года «Аб зацвярджэнні Указа Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь «Аб прымусовым лячэнні і працоўным перавыхаванні хранічных алкаголікаў» (ЗЗ БССР, 1974 г., № 36, арт. 608);

Закон Рэспублікі Беларусь ад 25 снежня 1974 года «Аб зацвярджэнні Указа Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь «Аб прымусовым лячэнні і працоўным перавыхаванні хворых наркаманіяй» (ЗЗ БССР, 1974 г., № 36, арт. 610);

Палажэнне аб лячэбна-выхаваўчым прафілакторыі для хворых наркаманіяй, зацверджанае Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь ад 22 верасня 1986 года (ЗЗ БССР, 1986 г., № 28, арт. 364; 1987 г., № 22, арт. 282).

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь
С. ШУШКЕВІЧ.

14 лістапада 1991 г.
гор. Мінск.

Закон Рэспублікі Беларусь

Аб унясенні дапаўнення ў Закон Рэспублікі Беларусь «Аб Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь»

Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь **пастанаўляе:**

1. Утварыць Міністэрства па справах абароны Рэспублікі Беларусь.

2. Артыкул 25 Закона Рэспублікі Беларусь ад 20 чэрвеня 1979 года «Аб Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь» (ЗЗ БССР, 1979 г., № 18, арт. 296; 1990 г., № 21, арт. 370; Ведамасці Вярхоўнага Савета Беларускай ССР, 1991 г., № 10 (12), арт. 117; № 28, арт. 424) пасля слоў «Міністэрства лёгкай прамысловасці Рэспублікі Беларусь» дапоўніць словамі «Міністэрства па справах абароны Рэспублікі Беларусь».

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь
С. ШУШКЕВІЧ.

15 лістапада 1991 г.
гор. Мінск.

НАРОДНАЯ ГАЗЕТА

Зрабіце свой выбар, грамадзяне!

Віталь КОШАЛЕЎ:

«Я—ДОКТАР. І ТАМУ ВЕДАЮ, ЯК ДАПАМАГЧЫ ЛЮДЗЯМ...»

Па праўдзе кажучы, зараз на кожнага жадаючага заняць свабоднае месца ў беларускім парламенце глядзіш, як на дзівака. Асабліва калі чалавек мае добрую працу, умелыя рукі, разумную галаву. Чаго ж нялёгкая нясе яго ў палітыку, ад якой у людзей ужо зводзіць сківіцы? Хіба не ведае бедалага, што на выбарчыя ўчасткі людзей сёння можна заманіць хіба толькі бясплатным півам?..

— Ведаю, ведаю ўсё, — уздыхае мой субяседнік, кандыдат у народныя дэпутаты Вярхоўнага Савета Беларусі па сталічнай Грушаўскай акрузе № 14 Віталь Кошалеў.— Але ж пры такой грамадзянскай пазіцыі мы ніколі лепш жыць не будзем. Не працуе на поўную моц парламент — буксуе і наша жыццё. Так што, хаця апатыю людзей можна зразумець, канструктыўнага ў такім байкоце мала. Якое ж гэта будзе ў нас народаўладдзе, калі сам народ абыякавы да таго, каго выбірае ў органы ўлады?!

— Дык толку пакуль што ад абраных мала...

— А што ж вы хацелі: з пекла — ды ў рай?! Не, так не бывае. Я, напрыклад, таксама не веру, што наш сённяшні Вярхоўны Савет вельмі дзеяздольны — такі, як і мы самі. ні больш, ні менш. Але ж пасля выбараў рукамі ўжо не махаюць. І разганяць яго, як таго многія патрабуюць, — не выйсце. Безуладдзе яшчэ нікому не дапамагала, асабліва ў цяжкія часы. Так што наш парламент, лічу, трэба рэфармаваць знутры, «уліваючы» у яго новыя сілы, не звязаныя з догмамі розных «класікаў».

— Каб не апарыць часам нос, паспадзяваўшыся толькі на свой розум. Палітыка — справа тонкая...

— ...Але не танчэй за жыццё. Я — доктар і таму ведаю, што гавару. Мне, прынамсі, не вельмі зразумелыя заклікі да стварэння так званага прафесійнага парламента. Што, там павінны быць адны юрысты? Шырэй трэба глядзець. Галоўнае, па-мойму, для парламентарыя — уменне бачыць сітуацыю, рабіць аб'ектыўны аналіз, ставіць дыягназ і лячыць хваробу. Гэта мая пастаянная праца і таму, спадзяюся, такі доктарскі вопыт спатрэбіцца і ў палітыцы.

— Наколькі я ведаю, вы добра пакаштавалі гэтай палітыкі, калі абаранялі літоўскі парламент у тую, дагэтуль памятную трывожную зіму 1990 года...

— Было такое. Я здаўна прыглядаўся да працэсаў, якія ішлі ў Прыбалтыцы, рабіў аналіз і бачыў, што да незалежнасці рана ці позна прыйдзем і мы, беларусы. Ад грамадзянскай пазіцыі кожнага ў тыя дні залежала многае. Адседжвацца па хатах не было як. Справа ж ішла да замаху на агульначалавечыя каштоўнасці. Рабы шчаслівае жыццё ніколі не пабудуюць. А свабода і дэмакратыя нацыянальных межаў не маюць.

— Каб жа так... А то ж куды ні зірні зараз — вайна, стрэлы, кроў...

— Разумею. Паверце, наша прафесія таксама вучыць быць прагматыкам, рэальна глядзець на жыццёвыя з'явы. І за хірургічны нож брацца калі трэба.

А кроў льецца зараз, па-мойму, у краіне якраз таму, што замест таго, каб цярпліва і загадзя рабіць прафілактыку многіх сацыяльных з'яў, іх рэжуць, як кажуць, па жывому. Вось вам і кроў. Таму нашу Беларусь ад такога варыянта трэба ўтрымаць усімі сродкамі. А яны яшчэ ёсць, сітуацыя ў нас паддаецца кантролю, яе можна прагназіраваць. Гэта многае значыць.

— Ну, і які б дыягназ нашай Беларусі паставіў бы зараз доктар Кошалеў?

— Ёсць такая хвароба, з якой я часта сустракаюся ў практыцы, пад назваю «чырвоная ваўчанка». Знешне чалавек быццам яшчэ нічога, толькі месцамі на целе высыпы, а на самай справе — усё нутро ў яго ўжо безнадзейнае. Калі толькі мазаць гэтыя высыпы, а не лячыць нутро, увесь арганізм, — фатальнага зыходу не пазбегнуць.

Амаль такі б дыягназ я паставіў бы зараз і рэспубліцы. Без карэнных рэформаў не абысціся, як бы цяжка гэта ні было. І не трэба нам зноў выдумляць кола: асноўныя этапы такога шляху прайшла Польшча, праходзіць Прыбалтыка, іншыя краіны. Ёсць вопыт, які трэба не баяцца ўзяць, ёсць відавочныя памылкі, якіх нам паўтараць не трэба. І таму мая перадвыбарчая праграма простая:

▲ захаванне здароўя і жыццёвага ўзроўню тых, хто найменш абаронены ва ўмовах рынку: пенсіянераў, інвалідаў, дзяцей;

▲ магчымасць зарабіць кожнаму столькі, колькі дазваляюць здольнасці;

▲ вяртанне традыцыйных агульналюдскіх каштоўнасцей, адраджэнне культуры і гістарычнай спадчыны Беларусі, усіх нацыянальнасцей рэспублікі;

▲ забеспячэнне ўдзелу кожнага ў працэсе раздзяржаўлення маёмасці, спыненне «дзікай прыватызацыі» на карысць былой наменклатуры;

▲ рэформа сістэмы аховы здароўя на прынцыпах страхавой медыцыны;

▲ абарона чалавека ад вынікаў Чарнобыля, хімізацыі і іншага гвалту над прыродай.

— Ну, і яшчэ такое пытанне. Як сталася, што доктара вылучае ў кандыдаты быццам бы далёкае ад вашых інтарэсаў Таварыства беларускай мовы?

— Яно для мяне не далёкае. Я проста вельмі люблю Бацькаўшчыну, хачу ведаць пра яе ўсё. І таму маім захапленнем заўсёды была гісторыя. Доўга вывучаў сімволіку Беларусі, сабраў багаты матэрыял. Частка яго, дарэчы, была выкарыстана і пры падрыхтоўцы артыкула для «Народнай газеты».

Словам, у мяне ёсць пра што пагаварыць з гісторыкамі ды навукоўцамі па гэтаму пытанню...

— Нешта, здаецца, надта аптымістычнае інтэрв'ю ў нас з вамі атрымліваецца. Таму на заканчэнне давайце яшчэ трохі пасумуем: што найбольш вярэдзіць доктарскую душу?

— Ды рознае. Хваробы, якіх у цывілізаваных краінах даўно не ведаюць, вялікі траўматызм, абыякавасць да людскога здароўя. А яшчэ — наша палітычная раўнадушнасць. Я вось нядаўна прайшоўся па сваім раёне і дагэтуль не магу супакоіцца. Многія жыхары нават не ведаюць, што яны не маюць у парламенце свайго дэпутата, які б мог абараніць іх інтарэсы ў вярхоўным органе ўлады! Як жа тады спадзявацца на лепшае жыццё?!

Эх, Віталь Клаўдзіевіч... Вашу б занепакоенасць — ды ўсім нам.

Павел СТАСЕВІЧ.
Фота Сяргея ГРЫЦА.

Спытайце Юру / Спросите Юру

Глядзі, Кардэн, — зайздросць!

Юрась, скажы, дзе можна набыць мужчынскую кашулю з вышытым беларускім арнаментам? Колькі яна каштуе, калі прадаецца?

Паўлюк ГАРБАЦЮК.

Камянецкі раён.

А якая, Паўлюк, табе патрэбна кашуля: таннейшая ці даражэйшая? Дырэктар вытворча-мастацкага камбіната Саюза тэатральных дзеячаў Беларусі Станіслаў Асіпацкі паведаміў: звычайная ільняная кашуля каштуе 100 рублёў. Але калі ты не пашкадуеш з паўтысячы, то тутэйшыя ўмельцы пашыюць табе рэч, перад якой ахне і сам Кардэн. Яе адразу хоць на выставу ці пад музейнае шкло, бо яна будзе адзінай і непаўторнай, і захоўваць стылістычныя асаблівасці Камянецкага раёна. Дарэчы, удзельнікам мастацкай самадзейнасці заказ можна зрабіць і праз свой аддзел культуры. А вось прыватным асобам трэба звяртацца непасрэдна ў Мінск на Старавіленскі тракт, 88. Спытайце дырэктара камбіната і падрыхтуйце грошы. Не пашкадуеце.

Поездом в Москву? Спросите «мафию»

Слышал, что в Минске развила бурную деятельность железнодорожная мафия и купить билет до Москвы в кассе почти невозможно.

Петр ИВАНЧУК.

г. Минск.

Так точно, она самая. Видел лично: мужского пола, 16 лет от роду, учится в одной из минских средних школ. 22 ноября продал семь железнодорожных билетов до Москвы, скупленных в предварительных кассах. Заработал на этом 210 рублей на кино и мороженое.

Да, любим мы таинственное. Ранее мерещился призрак коммунизма, теперь грезится мафия. В Белорусском управлении внутренних дел на транспорте в призраков не верят— уважают факты. А они говорят —щупальца мафии тут ни при чем. Есть нечестные на руку проводники и кассиры, отдельные граждане, спекулирующие железнодорожными билетами на Москву и на поезда южного направления. Занятие это, с точки зрения Уголовного кодекса, безопасное. Ведь билет, с точки зрения буквы закона, не является материальной ценностью. Так, бумажка. И пока законодатели спят, изобретательные люди не дремлют, используя прорехи в уголовном праве себе на корысть.

Увы—никак нет!

Моего сына в июне 1991 года призвали в армию, и сейчас он заканчивает учебку в Литве. Скажите, может ли он перевестись служить в Беларусь, ведь теперь все белорусы могут по желанию проходить службу в республике?

Эдуард КАМСКИЙ.

г. Гомель.

Я тоже так думал, накручивая телефонный номер пресс-центра Белорусского военного округа. Оказалось, не все. С точки зрения военной логики, призванные Горбачевым и Язовым граждане Беларуси должны дослужить на старом месте... Перевод в Беларусь можно оформить в исключительных случаях по семейным обстоятельствам. А вот нынешние призывники уже будут иметь право выбора. По своему армейскому опыту скажу, что гораздо легче переносить тяготы подальше от родного дома: крамольных мыслей гораздо меньше в голову лезет да и свет повидаешь, ведь Литва — уже заграница.

Что Джон не сносил, Иван доносит

Столичный универмаг «Звезда» низко пал — торгует гуманитарной помощью, да еще поношенной. Как не стыдно?

Светлана УРГЕНЧИК.

Молодечненский р-н.

Довольно слухов. Редакционный телефон уже разрывается от негодующих звонков по этому поводу. Я поехал и узнал, что никакая это не гуманитарная помощь. Просто работникам окружного универмага «Звезда» надоело пугать горожан пустотой прилавков. Взяли и заключили с фирмой «Евро энтерпрайз лимитед» контракт на поставку ношеных импортных товаров (обувь, одежда).

Успех превзошел все ожидания. Магазин снова вспомнил утренние штурмы и покупателей, чертящих номер очереди на ладони. Только за первые два дня торговли выручка превысила 25 тысяч рублей. Однако не обошлось и без эксцессов. Обозленные тотальным дефицитом горожане, по привычке хватая по нескольку пар импортных обносков, не забывают при этом ругнуться в адрес продавцов. На что те философски замечают: не хочешь — не бери.

Адказ-карацелька

Марыне ШУТАВАЙ (г. Брэст).

Калядны пост пачаўся 28 лістапада і працягнецца 40 дзён. У гэтыя дні веруючыя адмаўляюцца ад ужывання мясной і малочнай ежы і цалкам пераходзяць на ежу расліннага паходжання (агароднiна, садавіна, хлеб, грыбы, ягады і г. д.), а таксама рыбу (акрамя серады і пятніцы). Для іх гэта — частка духоўнага жыцця. Для нас, на жаль, проста дыета.

Пишите письма!

ЗАРУБЕЖЬЕ

Из кафе—в банк

БОГОТА. Миллионы долларов и драгоценная бижутерия выкрадены из Сельскохозяйственного банка в столице Колумбии. Грабители прорыли 14-метровый подземный ход из ближайшего кафе, пробили стальную стену подвала и очистили все частные сейфы.

Виновен? Отвечай

ВАШИНГТОН. Верховный суд США, основываясь на федеральных законах о правах человека, единогласно принял постановление, позволяющее привлекать представителей органов власти к ответственности за ущерб, нанесенный ими при исполнении служебных обязанностей. Постановление суда лишает представителей власти абсолютного иммунитета, которым по-прежнему будут обладать президент США и судьи, исполняющие официальные обязанности.

(«Народная газета»—ТАСС).

Необычный приговор

Окружной судья из штата Техас признал местного жителя Джеймса Ван Дейка виновным в непредумышленном убийстве некого Пола Митчела.

Ван Дейк в качестве наказания должен каждый год возлагать цветы на могилу погибшего в годовщину его смерти.

Человек, который никогда не ел

Как сообщило агентство ЮПИ, в техасском городе Хьюстоне в 20-летнем возрасте скончался некий Джейсон Уайт, который, пожалуй, будет занесен в Книгу рекордов Гиннесса, поскольку за всю свою жизнь не принимал ни грамма твердой или жидкой пищи.

Уайт родился с врожденным пороком желудка и дотянул до 20-летнего возраста исключительно на внутренних инъекциях.

666—цифра нечистой силы

Министерство транспорта Великобритании распорядилось заменить на новые все автомобильные номерные знаки, начинающиеся с цифр 666, поскольку это число с библейских времен ассоциируется с происками дьявола.

Представитель управления регистрации автомобилей заявила, что ее ведомство получает множество писем с просьбой заменить несчастливые номера. Один из обладателей «трех шестерок» написал, например, что на его машину напала бешеная лисица, а разные птицы 22 раза бились о лобовое стекло. Некий арестованный убийца сообщил на следствии, что пошел на преступление под влиянием бесовской силы, исходящей от его «трехшестерочного» автомобильного номера.

Власти решили проблему раз и навсегда: номеров с тремя шестерками отныне на английских дорогах не будет.

1 декабря — Всемирный день борьбы со СПИДом

Не махайте беспечно рукой,

потому что угроза уже ходит за нами по пятам...

Так устроен человек, что всегда думает: беда со мной не случится. Беды же подкарауливают нас на каждом шагу. Новая угроза — СПИД...

Вирус иммунодефицита человека (ВИЧ) поражает клетки иммунной системы. И тогда обычная простуда может вызвать смертельную болезнь.

Проникнув в организм человека, вирус вначале никак себя не проявляет, а постепенно расселяется по различным органам и тканям. Человек уже заражен, но выявить это практически невозможно. Здоров, но опасен для окружающих. Эта стадия может длиться месяцы и годы, и лишь когда появятся видимые признаки болезни — вздутие лимфатических узлов, худоба, мучнистый оттенок кожи, повышенная температура, держащаяся месяцами «без причин», поносы, кашель, слабость, потливость — тогда ясно: спасения нет. Дальше—больше. Под действием вируса у больного появляются злокачественные опухоли или развиваются различные инфекционные процессы. Одинаковых организмов нет, каждый борется по-своему, но исход всегда трагичен.

Пока нет лекарств, убивающих вирус, нет вакцины, предупреждающей заболевание. Заражение же происходит несколькими путями: половым, через зараженную кровь и ее препараты и от матери к ребенку.

Любой человек может заболеть СПИДом, пользуясь нестерильными инструментами при введении лекарственных препаратов и при обычной стрижке в парикмахерской.

Специалисты полагают, что число людей, зараженных этой болезнью в 30—50 раз больше, чем выявлено. Большинство зараженных — молодые люди, которые не подозревают о своем заболевании. Их численность ежегодно увеличивается примерно вдвое. По прогнозам ученых, в течение 6—10 лет половина из них заболеет СПИДом, а примерно через год после начала активной формы они умрут. Половина младенцев, родившихся от зараженных СПИДом матерей, станут носителями вируса и погибнут, так и не переступив порог школы.

Как ни банально это звучит, но лучшим оружием в борьбе со СПИДом является поведение, образ жизни каждого из нас и общества в целом. Это вовсе не значит, что надо отказаться от дарованной человеку радости физической любви. Не будем ханжами. Но единобрачие, супружеская верность, отказ от случайных половых связей практически гарантируют: встретиться с этой чумой нашего века вам не придется.

Наталья РОССА,
заведующая диспансерным отделом Республиканского центра по профилактике и борьбе со СПИДом.

КСТАТИ...

